3. Введение в гендерные исследования / Под общ. ред. И. В. Костиковой. М., 2005.
4. *Дегтярев А. А.* Основы политической теории. М., 1998.

# ФІЗІЯКРАТЫЗМ – АСНОВА РЭФАРМАВАННЯ ГРАМАДСКАГА ЛАДУ

**А. І. Голубева**

Школа фізіякратаў узнікла ў Францыі. Тэорыі фізіякратаў распрацоўваліся таксама ў Італіі, Вялікабрытаніі, Германіі, Швецыі і інш. Заснавальнік кірунку фізіякратаў – Ф. Кенэ, асноўныя прад-стаўнікі – П. С. Дзюпон дэ Немур, В. Мірабо, Г. Летрон, П. Мерсье дэ ла Рыўер. Філасоўская аснова вучэння фізіякратаў – ідэя натуральнага права. У процівагу меркантылізму фізіякраты лічылі, што асноўнае багацце дзяржавы паходзіць з вытворчасці, найперш сельска-гаспадарчай, а не з грашовага абарачэння. Фізіякраты адстойвалі ідэю неўмяшання дзяржавы ў эканоміку, крытыкавалі спробы ўлады рэгуляваць прамысловасць, асабліва з дапамогай падаткаабкладання. Філасофскай асновай вучэння фізіякратаў было натуральнае права. Фізіякраты лічылі, што асноўнае багацце дзяржавы складае сельская гаспадарка.

У другой палове XVIII стагоддзя на тэрыторыю Беларусі пачалі пранікаць навукова-філософскія ідэі заходнееўрапейскіх асветнікаў Ф. Вальтера, Ж. Ж. Руссо, Д. Дзідро, Р. Декарта і іншых. Разам з ідэалогіяй французскіх мысліцеляў фізіякратызм атрымаў шырокае распаўсюджванне ў Беларусі [2; 3].

Фізіякраты выступалі супраць прыгоннага права і даказалі неабходнасць капіталістычнага спосабу вядзення сельскай гаспадаркі. Найбольш знакамітымі прадстаўнікамі фізіякратызму таго часу былі І. Страйноўскі, І. Храптовіч і А. Тызенгаўз [2, с. 96–99]. Яны вызначалі асноўныя ў Беларусі напрамкі рэфармавання дзяржавы і грамадства, прававой сістэмы.

Прыхільнікам ідэі натуральнага парадку выступаў І. Страйноўскі, які разумеў пад ім адзінства фізічнага і маральнага парадку, законаў прыроды і грамадства. І. Страйноўскі паслядоўна абгрунтаваў залежнасць шчасця народа і разумнае грамадскае ўпарадкаванне ад узроўню адукаванасці насельніцтва. Ён адстойваў праграму прагрэсіўнага шляхецкага буржуазнага блоку, зацікаўленага ў правядзенні неабходных сацыяльна-палітычных рэформ [1, с. 416–417]. У сваёй працы «Навука аб прыродным і палітычным праве, палітычнай эканоміі і праве народаў» ён выклаў тэарэтычныя асновы буржуазнага грамадства, паказваючы сябе прыхільнікам асабістай свабоды, прыватнай уласнасці, наёмнай працы.

Асновай сацыяльнай канцэпцыі І. Страйноўскага было вучэнне пра натуральны парадак рэчаў і як вынік яго – натуральнае права. Людзі, на яго думку, могуць быць шчаслівымі толькі праз глыбокае пазнаннне і поўнае захаванне гэтага права; адыход чалавека або грамадства ад дакладных і разумных законаў прыроды непазбежна выклікае «пакаранне».

Больш поўнае ўяўленне пра светапогляд І. Храптовіча даюць яго творы «Пра штогодняе аднаўленне краіны» і «Пра натуральнае права». Асэнсоўваючы грамадскае жыццё, ён адзначыў наяўнасць у ім «натуральнага парадку», які ўстанаўлівае правы і абавязкі ўсіх членаў грамадства. Для падтрымкі такога парадку ў супольным жыцці заключаюцца дагаворы. Чым бліжэй закон да натуральнага права, тым больш ён справядлівы. У цэнтры ўсяго знаходзіцца чалавек з яго патрэбамі, інтарэсамі, правамі і абавязкамі. Паколькі задавальненне патрэб чалавека магчыма толькі ў грамадстве, то кожны павінен лічыцца з патрэбамі іншых членаў грамадства. Але людзі значна адрозніваюцца адзін ад аднаго сваім маёмасным становішчам. І тым не менш, як вынікае з натуральнага парадку рэчаў, кожны павінен працаваць на тым месцы, якое яму натуральна наканавана, не імкнучыся пранікнуць у закрытую для яго сферу [1, с. 456–457]. Маральны парадак Храптовіч ставіў у залежнасць ад фізічнага парадку прыроды. Маральныя законы цалкам адпавядаюць таму, што карысна і неабходна чалавеку ў яго жыцці. Тэарэтычная і практычная дзейнасць І. Храптовіча набыла шырокую вядомасць як на радзіме, так і за мяжой.

Праведзеныя А. Тызенгаўзам аграрныя пераўтварэнні згодна з яго планам хоць і павялічылі на першых парах даход у каралеўскі скарб, але разам з тым выклікалі моцны пратэст сялянства. Падданае насельніцтва, якое на працягу даволі доўгага часу мела пэўную эканамічную свабоду (за карыстанне зямлёй плаціла толькі чынш), успрыняла як цяжар перавод на паншчыну [3, с. 163]. Такая перамена спосабу гаспадарання не стала стымулам для эканамічнага развіцця сталовых маёнткаў у другой палове XVIII ст.

Галоўнымі ўмовамі рэфармавання грамадства фізіякраты лічылі ўвядзенне ў дзеянне законаў, якія заснаваны на натуральным праве, і забяспечванне высокага ўзроўню адукаванасці насельніцтва. Галоўным багаццем яны лічылі зямлю, а самай прадукцыйнай працай лічылі працу земляробаў. Таму яны і выступалі супраць прыгоннага ладу, які стрымліваў развіццё сельскай гаспадаркі. Фізіякраты прытрымліваліся тэорыі натуральнага права і дагаворнага паходжання дзяржавы.

**Літаратура**

1. Асветнікі зямлі Беларускай: Энцыкл. Даведнік / Рэдкал.: Г.П. Пашкоў і інш. Мінск : БелЭн, 2001. С. 496.
2. *Вішнеўская І. У.* Гісторыя палітычнай і прававой думкі Беларусі. Мінск: Тэсей, 2004. С. 271.
3. *Шалькевіч В. Ф.* Гісторыя палітычнай і прававой думкі Беларусі. Мінск: Маладзёжнае навуковае супрацоўніцтва, 2002. С. 248.

# ОБЕСПЕЧЕНИЕ ИНФОРМАЦИОННОЙ БЕЗОПАСНОСТИ ГОСУДАРСТВА

**Е. А. Грищенко**

Безопасность – сложнейшее явление общественной жизни, представляющее собой состояние защищенности жизненно важных интересов общества от угроз, представляющими противоположно направленные интересы. Обеспечение безопасности есть деятельность субъекта обеспечения, направленная на установление необходимого баланса интересов и поддержание такого состояния.

Современное общество все чаще именуется информационным. Информационная сфера прочно укоренилась в общественной жизни и продолжает развиваться. Как отмечают М.В. Мясникович и В.В. Пузиков, информационная безопасность является системо-образующим фактором для иных видов безопасности. [1, с. 336] Данный прогресс дал толчок к появлению и развитию информационной сферы безопасности и необходимости ее обеспечения. Такие государства как Франция, Литва, Украина, уже закрепили концептуальные основы обеспечения информационной безопасности в системообразующих документах в области обеспечения безопасности [2, с. 129].

Ряд государств (Россия, США) можно назвать практиками в области обеспечения безопасности. Так, например, в США уже в 1994 году в докладе Объединенной комиссии по безопасности говорилось: «Уже признано, что сети передачи данных превращаются в поле битвы будущего. Информационные технологии позволят обеспечить разрешение геополитических кризисов, не производя ни единого выстрела. Наша политика обеспечения национальной безопасности должна быть направлена на защиту наших возможностей по ведению информационных войн». [2, с. 131] Способы и силы информационного противоборства американские специалисты объединили понятием «стратегическая коммуникация». Ее основные инструменты:

- публичная дипломатия – информирование международной общественности, установления и поддержание контактов в сфере образования и культуры с целью формирования привлекательного образа страны;